Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце БДУКМ
_________________ С. Л. Шпарло
23 01 2023 г.
Рэгістрацыйны № ВД-524/эвуч.

# УВОДЗІНЫ У СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА СПЕЦЫЯЛІСТА

Вучэбная учэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)*

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяьнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках), зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2022 г. № 78, вучэбных планаў БДУКМ па напрамку спецыяльнасці.

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*І.А.Смірнова*, прафесар кафедры эстраднай музыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*М.В.Аляксандровіч,* артыстка-вакалістка, вядучы майстар сцэны ўстановы «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр», народная артыстка Беларусі, дацэнт;
*Р.Г.Каленька,* дацэнт кафедры музычна-тэарэтычных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* эстраднай музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 20.10.2022);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 16.11.2022).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Неабходнасць вывучэння дадзенай вучэбнай дысцыпліны абумоўлена тым, што ў яе рамках студэнты-першакурснікі будуць атрымліваць першапачатковыя веды аб сістэме падрыхтоўкі ва ўстановах вышэйшай адукацыі спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)», аб сутнасці і спецыфіцы абранай імі прафесіі, а таксама неабходную інфармацыю, дазваляючую ім хутчэй адаптавацца да новых умоў вучобы ў.

Вучэбная дысцыпліна «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» цесна звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: «Асновы інфармацыйных тэхналогій» І «Методыка выкладання спецдысцыплін»

Значнасць дадзенай вучэюнай дысцыпліны выяўляецца тым, што яна арыентуе студэнтаў на ўсвядомленае, сур’ёзнае стаўленне да набыцця ведаў па абранай прафесіі, што ў цэлым спрыяе хутчэйшай і больш якаснай падрыхтоўцы выпускніка для работы ў галіне мастацтва эстрады.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – падрыхтоўка студэнтаў да ўсвядомленага і актыўнага ўдзелу ў навучальным працэсе установы вышэйшай адукацыі, фарміраванне ведаў і навыкаў, неабходных для ажыццяўлення паспяховай вучэбнай, навуковай і творчай дзейнасці.

Дасягненне пастаўленай мэты абумоўлівае рашэнне шэрагу *задач:*

– даць уяўленне аб сістэме падрыхтоўкі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў спецыяліста вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)»;

– сфармаваць першапачатковае паданне аб прафесіі ў сферы мастацтва эстрады;

– садзейнічаць папярэдняй распрацоўцы студэнтамі праграмы асобаснага прафесійнага станаўлення.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» павінна забяспечыць фарміраванне базавых прафесійных кампетэнцый:

– разумець мэты і задачы будучай прафесіі;

– ажыццяўляць інфармацыйны пошук у розных дакументных патоках і асноўных інфармацыйна-вышуковых сістэмах, праводзіць аналітыка-сінтэтычную апрацоўку інфармацыі.

Этапы засваення кампетэнцый дазваляюць выпускніку *ведаць*:

– спецыфіку падрыхтоўкі спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па накірунках спецыяльнасці;

– асаблівасці арганізацыі вучэбнай, творчай, навуковай і самастойнай работы студэнта;

– правілы пошуку і апрацоўкі інфармацыі, неабходнай для засваення ведаў і вырашэння адукацыйных і творчых задач (вучэбная, даведачная, навуковая літаратура на папяровых і лічбавых носьбітах);

– стратэгічныя задачы РБ у галіне забеспячэння інфармацыйнай бяспекі;

*умець:*

– эфектыўна выкарыстоўваць інфармацыю ВНУ для актыўнага ўдзелу ў навучальным працэсе, канцэртнай і грамадскай дзейнасці;

– рацыянальна арганізоўваць самастойную работу, вучэбны і вольны час;

– карыстацца вучэбнай, даведачнай, навуковай літаратурай на папяровых і лічбавых носьбітах;

– карыстацца існуючымі спосабамі абароны інфармацыі на этапах захоўвання, апрацоўкі, перадачы інфармацыі.

*валодаць:*

– катэгарыяльным апаратам тэорыі і гісторыі мастацтва эстрады;

– метадамі збора і захоўвання інфармацыі;

– метадамі арганізацыі самастойнай, вучэбай, творчай і навуковай працы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» ўсяго адведзена 90 гадзін, з іх 34 гадзіны аўдыторныя (22 гадзіны – лекцыі, 12 гадзін – семінарскія) заняткі. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Раздзел І. Уводзіны ў спецыяльнаць «Мастацтва эстрады (па напрамках)», напрамкі спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)», «Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка)», «Мастацтва эстрады (спевы)».

### *Уводзіны ў дысцыпліну*

Прызначэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста». Яе месца і роля ў падрыхтоўцы спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)». Асноўная мэта, задачы і змест вучэбнай дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Патрабаванні да заліка.

### *Тэма 1. Музычнае мастацтва эстрады РБ як сфера прафесійнай дзейнасці спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрадым ( па напрамках)»*

Музычнае мастацтва эстрады РБ як спецыфічны від чалавечай дзейнасці. Функцыянаванне музычнага мастацтва эстрады РБ. Прэзентатыўныя і рэпрэзентатыўныя формы існавання музычнага мастацтва эстрады ў РБ.

Грамадскія функцыі музычнага мастацтва эстрады: камунікатыўная, эстэтычная, кананічная, эўрыстычная, геданістычная, пазнавальна-асветніцкая, грамадска-пераўтваральная.

Сфера прафесійнай дзейнасці спецыяліста. Аб'екты прафесійнай дзейнасці спецыяліста. Віды і задачы прафесійнай дзейнасці спецыяліста. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры. Прынцыпы, на якіх грунтуюцца грамадскія адносіны ў сферы культуры.

### *Тэма 2. Мастацтва эстрады: асноўныя тэрміны і паняцці. Гістарычныя, сацыякультурныя перадумовы і этапы развіцця музычнага мастацтва эстрады Беларусі ў ХХ ст.*

Тэрмін і паняцце «Эстрада». Вызначэнне зместу паняцця «эстрада» ў сусветнай і беларускай мастацкай культуры. Гістарычная мадыфікацыя зместу паняцця «эстрада» у беларускай мастацкай культуры.

Тэрмін і змест паняцця «мастацтва эстрады».

Тэрмін і змест паняцця «музычнае мастацтва эстрады». Дамінантная прыкмета і дуалізм тэрміна.

Тэрмін і абгрунтаванне паняцця «спецыяльнасць мастацтва эстрады».

Гістарычныя і сацыякультурныя перадумовы развіцця музычнага мастацтва эстрады ў Беларусі. Этапы развіцця музычнага мастацтва эстрады Беларусі ў ХХ ст. Прафесійная музычная адукацыя як найважнейшы фактар далейшага развіцця музычнага мастацтва эстрады РБ.

### *Тэма 3. Нацыянальная сістэма адукацыі РБ ў сферы музычнага мастацтва эстрады. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў – вядучая установа вышэйшай адукацыі ў нацыянальнай сістэме адукацыі*

Трохузроўневая сістэма адукацыі РБ ў сферы музычнага мастацтва эстрады: 1) узровень пачатковай адукацыі – ДМШ/ДШМ (дзіцячая музычная школа і школа мастацтваў); 2) узровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі – ССУА (музычны коледж і музычнае вучылішча); 3) узровень вышэйшай адукацыі –УВА (універсітэт, інстытут).

Навукова-арыентаваная адукацыя, дадатковая адукацыя (праграмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, якія маюць вышэйшую адукацыю).

Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»: гісторыя, сучаснае становішча і перспектывы развіцця. Арганізацыйная структура ўніверсітэта, кірункі вучэбнай, творчай, навуковай і выхаваўчай працы.

Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі праз магістратуру, аспірантуру і дактарантуру. Саветы па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый па спецыяльнасцях «Тэорыя і гісторыя культуры», «Тэорыя і гісторыя мастацтва». Формы і віды дадатковай прафесійнай адукацыі. Выхаваўчая работа з моладдзю.

Грамадскія арганізацыі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», прафкам студэнтаў БДУКМ, студэнцкі савет БДУКМ.

### *Тэма 4. Кафедра эстраднай музыкі БДУКМ – галоўны цэнтр падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)»: арганізацыя вучэбнай, творчай, навукова-даследчай, самастойнай працы студэнтаў*

Гісторыя стварэння, сучаснае становішча і перспектывы развіцця кафедры мастацтва эстрады БДУКМ. Структура, кірункі вучэбнай, творчай, навуковай і выхаваўчай працы, прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры. Творчыя калектывы кафедры.

Агульная мэта кафедры – фармаванне прафесійных кампетэнцый для далейшай працы выпускнікоў у выканальніцкай, педагагічнай і навуковай сферах дзейнасці.

Прадмет дзейнасці кафедры: 1 – навучанне і выхаванне высокакваліфікаваных спецыялістаў у вобласці эстраднага мастацтва і адукацыі; 2 – ажыццяўленне творчай і навукова-даследчай дзейнасці ў сферы эстраднага мастацтва; 3 – стварэнне, захаванне і развіццё нацыянальнай выканальніцкай, музычна-педагагічнай і мастацтвазнаўчай школ у вобласці музычнага мастацтва эстрады як сукупнага кампанента мастацкай культуры Рэспублікі Беларусь.

Вучэбная работа. Арганізацыя навучальнага працэсу па гадах і семестрах суадносна раскладу, складзенаму ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі, працоўнымі планамі і графікам навучальнага працэсу. Асноўныя віды навучальных заняткаў; навучальная практыка, педагагичная практыка, вытворчая практыка. Залікова-экзаменацыйныя сесіі.

Творчая работа. Узаемасувязь са спецыяльнымі дысцыплінамі і патрабаваннямі, якія ставяцца да прафесійных кампетэнцый студэнта. Праца ў творчых калектывах кафедры і універсітэта. Канцэртная дзейнасць.

Навукова-даследчая работа. Удзел у навуковых канферэнцыях, семінарах, навуковых кружках; навуковыя даследаванні пры выкананні курсавых і дыпломных прац; індывідуальная праца з навуковымі кіраўнікамі; удзел у навукова-даследчай рабоце кафедры.

Самастойная работа. Работа над канспектам лекцый і падрыхтоўка да семінараў з выкарыстаннем метадычных, інфармацыйных і навукова-даследчых матэрыялаў.

Арганізацыя самастойнай працы студэнтаў на кафедры мастацтва эстрады: работа над музычнымі творамі і падрыхтоўка да індывудальных заняткаў па спецдысцыплінам, да конкурсаў і канцэртаў.

### *Тэма 5. Мадэль спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады»*

Спецыяльнасць «Мастацтва эстрады (па напрамках)» як сукупнасць тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў па асобнай галіне музычнага мастацтва і адукацыі.

«Адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь вышэйшая адукацыя I ступені Спецыяльнасць – 17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)» – галоўны дакумент, які устанаўлівае мэты і задачы прафесійнай дзейнасці спецыяліста, патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выпускніка ўстановы вышэйшай адукацыі.

Тыпавы навучальны план як асноўны дакумент, які вызначае ўтрыманне і рэжым падрыхтоўкі студэнта да выніковай дзяржаўнай атэстацыі.

Вучэбныя планы спецыяльнасці «Мастацтва эстрады (па напрамках)» напрамках спецыяльнасці: «Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)», «Мастацтва эстрады (спевы)», «Мастацтва эстрады (камп'ютарная музыка)». Групы вучэбных дысцыплін, іх прызначэнне і ўзаемасувязь.

## Раздзел II. Інфармацыйная культура спецыяліста

### *Тэма 6. Арганізацыя інфармацыйнай дзейнасці студэнтаў*

Інфармацыя як сукупнасць дадзеных, захаваных і распаўсюджаных ў часе і прасторы на матэрыяльным носьбіце.

Віды інфармацыі: візуальная (зрокавая), аўдыяльная (гукавая), аўдыёвізуальная (зрокава-гукавая).

Электронная інфармацыя. Сродкі абароны электроннай інфармацыі. Існуючыя спосабы абароны інфармацыі на этапах захоўвання, апрацоўкі, перадачы інфармацыі.

Інфармацыя навуковага характару: (манаграфіі, зборнікі навуковых артыкулаў, матэрыялы навуковых канферэнцый, даведнікі і інш.) Інфармацыя метадычнага характару (падручнікі, дыдактычныя дапаможнікі, тыпавыя і вучэбныя праграмы, вучэбна-метадычныя комплексы па дысцыплінах і інш.).

Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы (аўдыё- і відэазапісы канцэртаў, майстар-класаў, урокаў і інш.). Інфармацыйная дзейнасць студэнта – збор, апрацоўка, захоўванне, пошук, распаўсюджанне інфармацыі, фарміраванне інфармацыйнага рэсурсу. Метады пошуку і набыцці інфармацыі ў ВНУ. Сайты Internet.

### *Тэма 7. Дзяржаўная палітыка і асноўныя заканадаўчыя акты ў сферы адукацыі і інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі РБ*

«Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі» – галоўны заканадаўчы акт (збор законаў) ў сферы адукацы РБ.

Указ аб спецыяльным фондзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Закон Рэспублікі Беларусь «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі» – асноватворны акт рэгулявання інфармацыйных адносін у РБ.

«Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі» як сістэма афіцыйных поглядаў на нацыянальную бяспеку РБ у інфармацыйнай сферы. Сутнасць, змест, тэрміналогія Канцэпцыі.

Дзяржаўныя прыярытэты і стратэгічныя задачы ў галіне забеспячэння інфармацыйнай бяспекі РБ.

Бяспека масавай інфармацыі ў РБ. Дзяржаўнае рэагаванне на рызыкі, выклікі і пагрозы ў інфармацыйнай сферы.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва тэмы, раздзела | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія | КСР | |
| ***Раздзел I. Уводзіны ў спецыяльнасць «Мастацтва эстрады». Напрамкі «Інструментальная музыка», «Камп'ютарная музыка», «Спевы».*** | | | | |
| Уводзіны ў дысцыпліну. | 1 | | | |
| *Тэма 1.* Музычнае мастацтва эстрады РБ як сфера прафесійнай дзейнасці спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «мастацтва эстрады”. | 1 | 1 | 1 | Вуснае апытванне |
| *Тэма 2.* Мастацтва эстрады: асноўныя тэрміны і паняцці. Гістарычныя, сацыякультурныя перадумовы і этапы развіцця музычнага мастацтва эстрады Беларусі ў XX ст. | 4 | 2 | 2 | Кантрольная работа |
| *Тэма 3.* Нацыянальная сістэма адукацыі РБ ў сферы музычнага мастацтва эстрады. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў – вядучая вышэйшая навучальная установа у нацыянальнай сістэме адукацыі. | 2 | 1 | | |
| *Тэма 4.* Кафедра эстраднай музыкі БДУКМ – галоўны цэнтр падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «мастацтва эстрады»: арганізацыя вучэбнай, творчай, навукова-даследчай, самастойнай працы студэнтаў. | 2 | 1 | 1 | Пісьмовае апытванне |
| *Тэма 5.* Мадэль спецыяліста вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады». | 2 | 1 | 1 | Вуснае апытванне |
| ***Раздзел II. Інфармацыйная культура спецыяліста*** | | | | |
| *Тэма 6.* «Арганізацыя інфармацыйнай дзейнасці студэнтаў» | 2 | 1 | 1 | Пісьмовае апытванне |
| Тэма 7. Дзяржаўная палітыка і асноўныя заканадаўчыя акты ў сферы адукацыі і інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі РБ | 4 | 2 | | |
| **УСЯГО: 34** | **18** | **10** | **6** | **залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. Гендина, Н. И. Информационная культура личности : учеб. пособие для вузов. В 2 ч. / Н.И. Гендина, Е.В. Козлова, Л.Н. Рябцева ; под науч. ред. Н.И. Гендиной. – 2-е изд. – М. : Юрайт, 2021. – 307 с.
2. Зуляр, Р. Ю. Информационно-библиографическая культура : учеб. пособие для студентов высших учебных заведений, обучающимся по гуманитарным направлениям /Р.Ю. Зуляр. – М. : Юрайт, 2021. – 143 с.
3. Кузьмініч, М. Л. Тэарэтычныя асновы методыкі музычнай адукацыі / М.Л. Кузьмініч. – Мінск : НББ, 2013. – 364 с.


*Дадатковая*


1. Брилон, О. Г. Белорусская эстрада. Ностальгический дивертисмент. История эстрады белорусской государственной филармонии. 1930–1980-е годы / О. Г. Брилон. – Минск : Альтиора Форте, 2021. – 699с.
2. Ландэ, Д. В. Поиск знаний в Internet. Профессиональная работа / Д. В. Ландэ. – М. : Изд. Дом "Вильямс", 2005. – 272 с.
3. Крушинсая, Л. Владимир Мулявин. Нота судьбы / Л. Крушинская. – Минск : Мастацкая літаратура, 2004. – 446 с.
4. Массовая культура : Учеб. пособие для вузов соц.-гуманитар. профиля / К. З. Акопян, А. В. Захаров, С. Я. Кагарлицкая и др.. – М. : Альфа-М: Инфра-М, 2004. – 301, [2] с.
5. Утесов, Л. О. Спасибо, сердце! / Л.Утесов. – М. : Вигрус, 2000. – 363 с.
6. Эстрада в России. XX век. Лексикон. – М. : Российская политическая энциклопедия, 2000. – 784 с.
7. Эхо, Ю. Письменные работы в вузах /Ю. Эхо. – 3-е изд. – М. : ИНФРА, 2002. – 127 с.

## Пералік інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў, рэкамендаваных для вывучэння вучэбнай дысцыпліны

1. Принципы исторической репрезентации белорусского музыкального эстрадного искусства в художественной культуре Беларуси: научно-методическое пособие / сост. И. А. Смирнова, Е. С. Смирнова, Т. В. Тарашкевич, А. А. Федорцова, Е. В. Шедова. – Мн. : БГУКИ, 2013.

2. Музыкальная энциклопедия «Музыкальное искусство эстрады Беларуси. XX век» [DVD – электронно-информационный ресурс] / сост. И. А. Смирнова, И. В. Левин, Е. Э. Миланич, Е. С. Смирнова, Е. В. Шедова. – Мн. : БГУКИ, 2013.

3. Терминологический словарь «Музыкальное искусство эстрады Беларуси. XX век» [DVD – электронно-информационный ресурс] / сост. И. А. Смирнова, И. В. Левин, Е. Э. Миланич, Е. С. Смирнова, А. А. Федорцова, Е. В. Шедова. – Мн. : БГУКИ, 2013.

## Метады і тэхналогіі выкладання вучэбнай дысцыпліны

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» здзяйсняецца з выкарыстаннем розных метадаў педагогікі:

– пасіўны метад (форма пасіўнага ўзаемадзеяння студэнта з выкладчыкам у працэсе засваення лекцыйнага матэрыялу);

– актыўны метад (форма актыўнага ўзаемадзеяння студэнта з выкладчыкам – рэжым дыялогу ў працэсе засваення лекцыйнага матэрыялу);

– інтэрактыўны метад (арыентацыя на шырокае ўзаемадзеянне студэнтаў не толькі з выкладчыкам, але і друг з другам, на дамінаванне актыўнасці навучэнцаў у працэсе практычных заняткаў);

– метады кантролю за эфектыўнасцю навучальна-пазнавальнай дзейнасці: вусныя, пісьмовыя праверкі і самаправеркі выніковасці авалодання ведамі, уменнямі і навыкамі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай працы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў па курсе «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста» прадугледжвае работу над канспектам лекцый і падрыхтоўку да семінараў з выкарыстаннем метадычных, інфармацыйных і навукова-даследчых матэрыялаў.

## Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі вынікаў навучальнай дзейнасці студэнтаў

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і ўжываецца комплексна:

1. заданні, якія прадугледжваюць самастойную работу з ужываннем інфармацыйнай, вучэбна-метадычнай і навуковай літаратуры;
2. пісьмовае і вуснае апытанне;
3. праверачныя кантрольныя работы.